
Фота: Peter A. Juley & Son Collection, Smithsonian American Art Museum

# Пітэр Блум

**Пітэр Блум (Peter Blume, 27 кастрычніка 1906 – 30 лістапада 1992), славуты амерыканскі мастак і скульптар беларускага паходжання.**

Блум нарадзіўся ў Беларусі ў Смаргоні, дзе жылі пакаленнямі ягоныя продкі. Паходзіў з габрэйскае сям'і, якая эмігравала ў Нью-Ёрк у 1912-м. На той час будучаму мастаку было 6 гадоў. Уражанні ранняга дзяцінства адлюстраваліся ў некаторых творах Пітэра. Атрымаўшы за акіянам школьную адукацыю, вывучаў мастацтва ў Адукацыйным альянсе ды Інстытуце дызайну Beaux-Arts. У Лізе студэнтаў мастацтваў Нью-Ёрку стварыў уласную студыю ў 1926 годзе. У творчасці Пітэра ў розны час прысутнічалі элементы народнага мастацтва, парыжскага пурызму, кубізму і сюррэалізму.

У ранніх працах, як The Parade (“Парад”, 1930, Музей сучаснага мастацтва, Нью-Ёрк), мастак спрабаваў знайсці ўласныя вобразы ў сімвалізме індустрыйнага свету. Наступныя працы Пітэра Блума атрымалі вядомасць ужо ў 1930-х гадах. У 1948-м яго абралі ў Нацыянальную акадэмію дызайну ў якасці асацыяванага ўдзельніка, а ў 1956-м Пітэр стаўся яе правадзейным чальцом.

Прыхільнік тэхнікі эпохі Адраджэння, Блум працаваў, маляваў і рабіў карыкатуры, перш як размясціць сваю працу на палатне. У 1932-м атрымаў стыпендыю Ґуґенгайма і правёў год у Італіі. Першае сур'ёзнае прызнанне прыйшло ў 1934 годзе з першым прызам за «Поўдзень ад Скрэнтану» на міжнароднай выставе Інстытуту Карнэйґі. Тая карціна была натхнёная падарожжам па Пенсільваніі старым аўтамабілем, што патрабаваў частага рамонту. Блум працаваў у аддзеле жывапісу і скульптуры Міністэрства фінансаў ЗША, намаляваў прынамсі дзве фрэскі ў паштовых аддзяленнях у Жэневе (Нью-Ёрк) і Кэнансбурзе (Пенсільванія).

Працы Блума часта адлюстроўвалі разбурэнне і аднаўленне адначасова.

«Скала» (1944–1948, калекцыя Інстытуту мастацтваў Чыкага) была вытлумачаная гледачамі як сімвал аднаўлення пасля Другой сусветнай вайны. «Успамін пра патоп» (1969) адлюстроўвае ахвяраў паводкі ракі Арна ў Фларэнцыі ў 1966 годзе разам з тамтэйшымі рэстаўратарамі за працаю. Вялікую частку творчасці Блума складаюць і ягоныя скульптурныя творы.

Беларускі радавод Пітэра Блума вымагае вывучэння. Як і ўплыў на ягоную творчасць уражанняў ад ранніх гадоў, праведзеных на радзіме. Але застаецца фактам, што творца нарадзіўся ў тутэйшай габрэйскай сям'і ў Беларусі, дзе і правёў сваё дзяцінства.